УДК 811.161.3:81'34

В. А. МАНДЗІК

ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ЗЫЧНАГА [Ц] У ЯКАСЦІ ДРУГОГА ЧЛЕНА ДВУХКАМПАНЕНТНЫХ КАНСАНАНТНЫХ СПАЛУЧЭННЯЎ

Працэс даследавання і апісання фанетычнай сістэмы мовы прадугледжвае ўлік дыстрыбуцыйных абмежаванняў, што ўплываюць на арганізацыю гукавой плыні. Гэтыя абмежаванні паказваюць на здольнасць / няздольнасць пэўнага гука / класа гукаў спалучацца з іншымі гукамі. Па словах М. С. Трубяцкога, «спалучэнні фанем падпарадкоўваюцца ў любой мове сваім асаблівым законам ці правілам, якія маюць значэнне толькі для дадзенай мовы і якія неабходна ўстанаўліваць для кожнай мовы асобна» [1]. Такім чынам, дыстрыбуцыйныя здольнасці фанем (як галосных, так і зычных) залежаць ад сінтагматычных адносін у фанетыцы.

Паводле артыкуляцыйных уласцівасцей, глухі [ц] разам з парным звонкім [ʒ] адносяць да змычна-шчылінных. Ён утвараецца шляхам змыкання языка з верхнімі зубамі; калі язык адрываецца ад зубоў сваёй парэдняй часткай, то з'яўляецца шчыліна. Другая фаза артыкуляцыі характарызуецца наяўнасцю шуму. Паколькі ў другой фазе органы мовы займаюць такое ж становішча, як і пры [с], цвёрдую афрыкату [ц] мы адносім да свісцячых [2]. Некаторыя заўвагі адносна функцыянавання [ц] як другога члена двухкампанентных кансанантных спалучэнняў былі зроблены А. І. Падлужным [3]. У прыватнасці, адзначана, што ў пачатку слова магчымае толькі адно спалучэнне падобнай структуры – [сц]. У сярэдзіне слова ў якасці першага кампанента такіх спалучэнняў з мяккіх зычных можа ўжывацца толькі [л'] – [л'ц]. Самыя распаўсюджаныя кансанантныя групы – «цвёрды зычны + [ц]» у сярэдзіне слова: [пц], [ўц], [йц]*, [кц], [нц], [рц], [тц], [хц], [шц], [цц]. Далей будуць падрабязна апісаны законы спалучальнасці цвёрдай афрыкаты [ц] з папярэднімі змычнымі і санорнымі ў двухкампанентных кансанантных групах у залежнасці ад іх пазіцыі ў слове.

---

* З пункту погляду карэляцыі цвёрдых і мяккіх зычных [й] адносіцца да мяккіх, бо перад ім змякчаецца, напрыклад, цвёрды [з]. Аднак у адрозненне ад іншых мяккіх [й] не мае адпаведнага парнага цвёрдага. Адсутнасць дыферэнцыяльных прыкмет дадзенай фанемы, верагодна, паслужыла прычынай разгляду А. І. Падлужным спалучэння [йц] як спалучэння «цвёрды + [ц]».

Спалучэнні «выбухны + [ц]». Да выбухных зычных у беларускай мове адносяцца тыя, якія паводле сваіх акустычных уласцівасцей маюць наступную структуру: змычка (глухая ў выпадку [п], [п’], [к], [к’], [т] і звонкая ў выпадку [б], [б’], [g], [g’], [д]) і выбух. Падобную акустычную будову мае і афрыкатыўны [ц], аднак адрозненне ад выбухных заключаецца ў колькасных фізічных параметрах: працягласць змычкі ў параўнанні з выбухнымі меншая, а даўжыня выбухнога сегмента з фрыкацыяй – наадварот, большая [4]. Так, на мал. 1 прадстаўлена асцылаграма слова *пацалунак*, якая дае нагляднае ўяўленне пра акустычную структуру гукаў [ц] (адпаведны сегмент вылучаны дзвюма вертыкальнымі лініямі) і [к] (канцавы ўчастак асцылаграмы). Бачым, што [ц] мае вельмі кароткую змычку (25 мс) і працяглы выбух (160 мс). У той жа час у выпадку [к] глухая змычка доўжыцца 140 мс, а выбух – толькі 20 мс.



Мал. 1. Асцылаграма слова *пацалунак*

Нягледзячы на тое, што фанетычная сістэма дазваляе двухкампанентныя спалучэнні выбухных **у пачатку слова** *(**пт**ушка, **тк**аніна)*, кансанантная група «выбухны + ц» у дадзенай пазіцыі забараняецца: намі не выяўлена слоў, якія б пачыналіся спалучэннямі [бц], [б’ц], [пц], [п’ц], [кц], [к’ц], [gц], [g’ц], [дц], [тц]. Заўважым, што гіпатэтычныя пачатковыя кансанантныя групы [дц], [тц] павінны былі б мець арфаэпічную рэалізацыю [ц:], гэта значыць, падоўжаны афрыкатыўны [ц] ужываўся б у пачатку слова. Дыстрыбуцыя падоўжаных зычных у беларускай мове абмяжоўвае іх вымаўленне ў пачатку лексем (выключэнне складаюць гукі, што рэалізуюцца на стыку прыставак *з-*, *с-* і каранёвых *ж, ш* – [ж:ац’], [ш:ыц’]; на пісьме – ***зж**аць, **сш**ыць*). Таму немагчымасць ужывання ў пачатку слоў спалучэнняў [дц], [тц] адпавядае агульным законам дыстрыбуцыі падоўжаных зычных у літаратурнай мове.

Што датычыць пазіцыі абсалютнага **канца слова**, то тут таксама не сустракаюцца двухкампанентныя спалучэнні «выбухны + ц». Прычым гэтае абмежаванне дзейнічае як для пачатковых форм слоў, так і для граматычных форм. Напрыклад, у склонавых формах назоўнікаў пасля спалучэнняў такой структуры абавязкова ідзе галосны – канчатак: *хло**пц**ам, хада**дц**у* і інш.

У той жа час шырокія магчымасці для ўзнікнення і функцыянавання спалучэнняў разглядаемай структуры дэманструе пазіцыя **сярэдзіны слова**. Так, кансанантная група [пц] можа сустракацца на месцы арфаграфічнага спалучэння *бц* (у выніку аглушэння змычнага) на стыку прыстаўкі і кораня або ў корані слова: *аб**ц**алаваць* [а**пц**алава́ц’], *зарубцаваны* [зару**пц**ава́ны], у тым ліку і ў запазычаных лексемах: *шрубцынга* [шру**пц**ы́нґа]. Аднак назіраецца больш выпадкаў функцыянавання этымалагічнага [п] без асіміляцыйных змяненняў: *адлу**пц**аваць* [адлу**пц**ава́ц’], *шчы**пц**ы* [шчы**пц**ы́], *куп**ц**оўскі* [ку**пц**о́ўск’і], *перцэ**пц**ыя* [п’эрцэ́**пц**ыйа]. Спалучэнне [кц] у беларускай мове пашырылася выключна за кошт адаптацыі іншамоўнай лексікі: *ва**кц**ына* [ва**кц**ы́на], *велаатра**кц**ыён* [в’э̀лаатра**кц**ыйо́н]. Большасць з гэтых запазычанняў – назоўнікі на *-цыя* і вытворныя ад іх прыметнікі: *карэ**кц**ыя* [карэ́**кц**ыйа] – *карэ**кц**ыйны* [карэ**кц**ы́йны], *інфе**кц**ыя* [інф’э́**кц**ыйа] – *інфе**кц**ыйны* [інф’э**кц**ыйны].

Арфаграфічныя спалучэнні *дц, тц* сустракаюцца пераважна на стыку прыстаўкі і кораня, а таксама кораня і суфікса: *а**дц**ураццa* [а**ц:**ура́ц:а], *пад**ц**украваць* [па**ц:**украва́ц’], *сі**тц**а* [с’і́**ц:**а], *карыт**ц**а* [кары́**ц:**а], *дара**дц**а* [дара́ц:а]. У маўленні дадзеныя спалучэнні рэалізуюцца як падоўжаны [ц:]. Інакш кажучы, у маўленчай плыні ва ўнутрыслоўнай фанетыцы кансанантны сегмент [тц] проста не існуе. Гэтае палажэнне пацвярджаюць вынікі аналізу акустычнай структуры адпаведных гукавых адрэзкаў. Звернемся да асцылаграфічнага аналізу слова *дарадца* (мал. 2). Гукавы сегмент, што адпавядае арфаграфічнаму спалучэнню *дц*, на асцылаграме выдзелены дзвюма вертыкальнымі лініямі. Замест мяркуемай паслядоўнасці «глухая змычка – выбух – глухая змычка – выбух» назіраем структуру «глухая змычка – выбухны сегмент з фрыкацыяй», уласцівую для афрыкаты [ц]. А на яе падоўжаны характар указвае павелічэнне даўжыні гучання змычкі – 160 мс (нагадаем, што ў непадоўжанага гука яна складала толькі 25 мс). Такім чынам, у выпадку падоўжанага [ц] на месцы *дц* змычка па працягласці набліжаецца да выбуху з фрыкацыяй.

Яшчэ адна пазіцыя, якую мэтазгодна ўлічваць пры выяўленні дыстрыбуцыйных уласцівасцей гукаў, – **становішча сандхі**. Гэты тэрмін вызначаецца як «пазіцыйна абумоўленае змяненне гукаў, якое ўзнікае на стыку слоў –



Мал. 2. Асцылаграма слова *дарадца*

знешняе сандхі – і марфем – унутранае сандхі» [5]. Прамежкавае становішча паміж знешнім і ўнутраным сандхі, зыходзячы з дадзенай дэфініцыі, належыць стыку частак кампазітаў і слоў, набліжаных да іх па сваёй акцэнтна-рытмічнай структуры, гэта значыць тых, у якіх можа ўзнікаць пабочны націск. З аднаго боку, у маўленні любы кампазіт павінен рэалізоўвацца як цэласнае фанетычнае слова. З другога – сандхіяльны стык кампазітаў, асабліва з напісаннем праз дэфіс (тыпу *флэш-застаўка*), можа ўспрымацца носьбітамі мовы як міжслоўны, і тады кансанантная дыстрыбуцыя выходзіць за межы ўнутрыслоўнай фанетыкі. Узнікаюць узуальныя варыянты, характэрныя для знешняга сандхі і абумоўленыя тэмпам вымаўлення: «Нават у тым выпадку, калі паміж канцом адной фанетычнай адзінкі і пачаткам другой адбываюцца тыя ж самыя працэсы, што і ўнутры слоў, гэтыя працэсы выказваюць большую ступень факультатыўнасці, залежаць ад тэмпу вымаўлення, тады як унутрыслоўнае сандхі ад тэмпу рэалізацыі не залежыць» [6]. Адметнасць фанетычнай структуры складаных і складанаскарочаных слоў прызнаецца і іншымі даследчыкамі, напрыклад, Л. Ц. Выгоннай: «Аналіз спалучэнняў гукаў у іх межах уяўляе значную цікавасць, бо яны набліжаюцца да тых, якія сустракаюцца на стыку двух самастойных слоў у фразах» [7]. Прымаючы пад увагу гэтыя акалічнасці, неабходна разгледзець сандхіяльны стык асноў кампазітаў як асобную пазіцыю для даследавання кансанантнай дыстрыбуцыі.

У дадзенай пазіцыі выяўлены двухкампанентныя спалучэнні [ц] толькі з папярэднімі выбухнымі [д] і [т]. Прычым гэта кампазіты, другую частку якіх складае слова *цэнтр* (са злітным напісаннем і з напісаннем праз дэфіс): *інтэрнэ**т-ц**энтр* [інтэрнэ**ц:**э́нтр], *развед**ц**энтр* [раз'в'э**ц:**э́нтр], *гідрамет**ц**энтр* [ɣ'і̀драм'э**ц:**э́нтр], *мед**ц**энтр* [м'э**ц:**э́нтр]. Пададзеная транскрыпцыя адлюстроўвае фанетычны воблік гэтых слоў у адпаведнасці з арфаэпічнай нормай і законамі ўнутрыслоўнай фанетыкі. Разгледзім спецыфіку размеркавання фанем на месцы арфаграфічных *дц, тц* на прыкладзе асцылаграфічнага аналізу слова *медцэнтр*. На мал. 3 бачым, што сандхіяльны стык афармлены ў адпаведнасці з нормай: разглядаемы сегмент складаецца з доўгай змычкі і выразнага выбухнога элемента з фрыкацыяй, што адпавядае вымаўленню падоўжанага [ц:]. Аднак магчыма і іншая рэалізацыя, прадэманстраваная на мал. 4. Тут адпаведны сегмент мае структуру «глухая змычка – выбух (на месцы гука [т]) – глухая змычка – выбух з фрыкацыяй (на месцы [ц])». Такім чынам, структура слова (наяўнасць дзвюх частак, дадатковае акцэнтнае афармленне першай з іх) можа значна павышаць ступень дэлімітатыўнасці асноў і ўплываць на дыстрыбуцыю фанем на сандхіяльным стыку: узнікаюць узуальныя варыянты, характэрныя для пазіцыі міжслоўнага сандхі. У нашым выпадку назіраецца функцыянаванне спалучэння [тц], забароненага законамі ўнутрыслоўнай фанетыкі, разам з нарматыўным варыянтам [ц:].



Мал. 3. Асцылаграма слова *медцэнтр* з падоўжаным [ц:]



Мал. 4. Асцылаграма слова *медцэнтр* са спалучэннем [тц]

Дыстрыбуцыя [ц] у двухкампанентных спалучэннях з папярэднімі выбухнымі дапускае спалучэнне толькі з цвёрдымі зычнымі: кансанантныя групы [б'ц], [п'ц], [к'ц], [g'ц] незалежна ад пазіцыі ў слове не ўжываюцца. Дыстрыбуцыйныя магчымасці функцыянавання [ц] у спалучэннях «выбухны + [ц]» адлюстраваны ў табл. 1.

Табліца 1. **Дыстрыбуцыя [ц] з папярэднімі выбухнымі ў двухкампанентных кансанантных спалучэннях**

Спалучэнне зычных у слове	Пазіцыя			
	пачатак	сярэдзіна	канец	сандхі
[бц]	–	–	–	–
[б'ц]	–	–	–	–
[пц]	–	+	–	–
[п'ц]	–	–	–	–
[кц]	–	+	–	–
[к'ц]	–	–	–	–
[gц]	–	–	–	–
[g'ц]	–	–	–	–
[дц]	–	–	–	–
[тц]	–	–	–	+
[цц]	–	+		+

Спалучэнні «санорны + [ц]». Да санорных у беларускай мове адносяцца зычныя, разнародныя з пункту погляду артыкуляцыі, аднак падобныя па акустычных уласцівасцях: для іх характэрна значная амплітуда перыядычных ваганняў і адсутнасць у складзе шумоў. Гэта зычныя [м], [м'], [н], [н'], [л], [л'], [р], [й], [ў].

Трэба заўважыць, што спалучэнні «санорны + шумны» не самыя распаўсюджаныя ў беларускай мове: гэтая група меншая па аб'ёме, чым групы «шумны + шумны» і «шумны + санорны» [8]. Зробленае А. І. Падлужным назіранне пра тое, што санорныя не могуць выступаць першымі членамі пачатковых кансанантных спалучэнняў [9], цалкам пацвярджаецца аналізам лексічнага матэрыялу сучаснай беларускай мовы. Такім чынам, у пазіцыі **пачатку слова** кансанантныя групы «санорны + [ц]» забаронены. Абмежаваны падобныя спалучэнні і ў **канцы слова**, зафіксаваны адзінкавыя выпадкі ўжывання: *рц (гер**рц**, кварц); нц (шан**нц**, прын**нц**, ксёндз* – [кс'о**нц**]*); льц (зе**льц**, фа**льц**); йц (*фле**йц**)*.* Зусім не ўжываюцца ў дадзенай пазіцыі спалучэнні *мц, мьц, ньц, лц, ўц*. Адзначым, што форма роднага склону множнага ліку назоўнікаў не пашырае функцыянаванне спалучэнняў падобнай структуры на канцы слоў, таму што пасля іх абавязкова ідзе матэрыяльна выражаны канчатак: *сэрца – сэрцаў* (а не *сэрц*), *лейцы – лейцаў, шкельца – шкельцаў, слоўца – слоўцаў* і інш.

У пазіцыі **сярэдзіны слова** кансанантныя групы «санорны + [ц]» прадстаўлены больш шырока. Так, спалучэнне *нц*, якое з'яўляецца адным з самых распаўсюджаных сярод двухчленных груп падобнай структуры [10], функцыянуе ў запазычанай лексіцы пераважна ў каранёвых марфемах *(э**нц**ыклапедыя, гля**нц**авы)*, а ў беларускай – як у корані, так і на стыку кораня і суфікса *(тан**ц**аваць, аке**нц**а, жаро**нц**ы)*. З папярэднім мяккім [н'] цвёрдая афрыката [ц] у беларускай мове не спалучаецца. Падобнае функцыянаванне характэрна для спалучэнняў *рц (інер**ц**ыя, падсэр**ц**авы, вядзер**ц**а), йц (швей**ц**ар, заляй**ц**аць, дбай**ц**а)*. Ужыванне спалучэння *ўц* у корані слова мае спарадычны характар *(аў**ц**абык)*, больш распаўсюджана яго функцыянаванне на марфемным стыку *(выканаў**ц**а, рэкламадаў**ц**а, слоў**ц**а, каліў**ц**а)*, у тым ліку ў граматычных формах назоўнікаў: *лавец – лаў**ц**а, баязлівец – баязліў**ц**ам* і інш. Кансанантная група *ўц* узнікае ў маўленні таксама пры спалучэнні праклітыкаў са словамі, што пачынаюцца з *уц*: *(не) уцэліць* [н'аў**ц**э́л'іц'], *(на) уцэнцы* [наў**ц**э́нцы]. Рэдкім для беларускай мовы з'яўляецца спалучэнне *мц (злям**ц**аваць, пісям**ц**о)*, а *мьц* – увогуле не характэрна. З папярэднім цвёрдым [л] цвёрдая афрыката [ц] у сярэдзіне слова спалучаецца спарадычна *(кол**ц**а, халцэдон)*, з папярэднім мяккім [л'] – значна часцей *(каль**ц**ый, сфаль**ц**аваць, шкель**ц**а, шчупаль**ц**ы)*.

Даныя адносна функцыянавання кансанантных груп «санорны + [ц]» у сярэдзіне слова карэлююць з ужываннем гэтых груп у **пазіцыі сандхі**. Так, на стыку кампазітаў і складанаскарочаных слоў зафіксаваны спалучэнні *нц (вагон-**ц**ыстэрна), мц (крум**ц**ыркуль), лц (ацэтыл**ц**элюлоза), льц (утыль**ц**эх),*

*рц (супер**ц**эмент), ўц (паў**ц**агліны), йц (рай**ц**энтр)*. Заўважым, што ў спалучэннях дадзенай структуры незалежна ад месца ў слове афрыката [ц] знаходзіцца ў моцнай пазіцыі, таму працэсаў фанетычнага прыпадабнення не назіраецца. Дыстрыбуцыйныя магчымасці функцыянавання [ц] у спалучэннях «санорны + [ц]» адлюстраваны ў табл. 2.

Табліца 2. **Дыстрыбуцыя [ц] з папярэднімі санорнымі ў двухкампанентных кансанантных спалучэннях**

Спалучэнне зычных у слове	Пазіцыя			
	пачатак	сярэдзіна	канец	сандхі
[мц]	–	+	–	+
[м'ц]	–	–	–	–
[нц]	–	+	+	+
[н'ц]	–	–	–	–
[лц]	–	+	–	+
[л'ц]	–	+	+	+
[рц]	–	+	+	+
[йц]	–	+	+	+
[ўц]	–	+	–	+

Такім чынам, цвёрдая афрыката [ц] мае дыстрыбуцыйныя абмежаванні пры спалучэнні ў двухкампанентных кансанантных групах з папярэднімі змычнымі і санорнымі. Гэтыя абмежаванні звязаны з пазіцыяй у слове (узнікненне груп «выбухны + [ц]» магчыма толькі ў сярэдзіне слова і становішчы сандхі, «санорны + [ц]» – яшчэ і ў абсалютным канцы слова), а таксама з характарам папярэдніх зычных. Так, у якасці першага члена спалучэнняў «выбухны + [ц]» не могуць выступаць мяккія змычныя і звонкія [б], [g], [д]. Функцыянаванне спалучэння [тц] абмежавана толькі пазіцыяй сандхі, групы [ўц], [лц], [мц] сустракаюцца ў сярэдзіне слоў і на сандхіяльных стыках.

Літаратура

1. Трубецкой, Н. С. Основы фонологии / Н. С. Трубецкой ; пер. с нем. А. А. Холодовича ; под ред. С. Д. Кацнельсона. – М. : Аспект Пресс, 2000. – С. 265.

2. Крывіцкі, А. А. Фанетыка беларускай мовы : вучэб. дапам. / А. А. Крывіцкі, А. І. Падлужны. – Мінск : Вышэйш. шк., 1984. – С. 36–37.

3. Падлужны, А. І. Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы / А. І. Падлужны. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – С. 47–54.

4. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / І. Р. Бурлыка [і інш.] ; рэд. А. І. Падлужны. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – С. 76.

5. Ахманова, О. С. Словарь лингвистических терминов / О. С. Ахманова. – 2-е изд., стер. – М. : Едиториал УРСС, 2004. – С. 394.

6. Пацехіна, А. Сандхі ў беларускай мове / А. Пацехіна // Sandhi w językach słowiańskich / pod red. A. Cychnerskiej. – Toruń, 2013. – С. 257.

7. Выгонная, Л. Ц. Спалучэнні гукаў у межах слова / Л. Ц. Выгонная // Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / І. Р. Бурлыка [і інш.] ; рэд. А. І. Падлужны. – Мінск, 1989. – С. 142.